УДК 001.891:[94:069](476)

*В. В. Навіцкая*

# Праблемы арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў гістарычных музеях Беларусі на сучасным этапе

*Разглядаюцца пытанні арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў гістарычных музеях Рэспублікі Беларусь і шляхі іх вырашэння.*

*Адзначаецца, што эфектыўнай навукова-даследчай рабоце сучаснага музея перашкаджаюць: недахоп кадраў і недастатковае фінансаванне; адсутнасць прынятага метаду вымярэння паспяховай працы навуковых супрацоўнікаў; «пагоня» за колькасцю наведвальнікаў; часовыя экспазіцыі; немузейныя мерапрыемствы; выкананне пазамузейнай работы па навукова-метадычным суправаджэнні дзейнасці раённых метадычных цэнтраў і інш. Аўтар прыходзіць да высновы, што пераадолець падобныя праблемы можна ва ўмовах сістэмнай працы супрацоўнікаў музея па ўдасканаленні падыходаў да навукова-даследчай работы, пошуку матывацыі для паспяховай самарэалізацыі кожнага даследчыка і імкнення калектыву развівацца ў сучасных абставінах.*

***Ключавыя словы:*** *гістарычны музей, навукова-даследчая дзейнасць, праблемы арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці, назапашванне, захаванне, сістэматызацыя крыніц, трансляцыя культурнай спадчыны, Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.*

*V. Navitskaya*

# Problems of organizing scientific research activities in historical museums of Belarus at the present stage

*The article considers the issues of organizing research activities in historical museums of the Republic of Belarus and ways to solve them.*

*It is noted that the following impede effective research work in a modern museum: shortage of personnel and insufficient funding; lack of a generally accepted method for assessing the success of scientific personnel; "chasing" the number of visitors; temporary exhibitions; non-museum events; implementation of extra-museum work on scientific and methodological support for the activities of district methodological centers, etc. The author comes to the conclusion that overcoming such problems is possible through systematic work of museum staff to improve approaches to research activities, search for motives for successful self-realization of each researcher, the desire of the team to develop in modern conditions.*

***Keywords:*** *historical museum, research activities, problems of organizing research activities, accumulation, preservation, systematization of sources, broadcasting of cultural heritage, National Historical Museum of the Republic of Belarus.*

З кожным годам усё больш увагі адводзіцца гістарычным музеям, якія ў сучаснай рэальнасці занялі месца пасрэдніцтва паміж навуковымі ўстановамі і рознаўзроставай аўдыторыяй. Ад музеяў па-

трабуюць агучыць адказы на пытанні, якія хвалююць сучаснае грамадства, і зрабіць гэта яны павінны ў даступным і зразумелым выглядзе з захаваннем гістарычнай праўды і наданнем фундаментальных імпульсаў для яе самаўспрымання. У той час, як навуковыя ўстановы заняты глабальным абагульненнем новых даных і іх уводам у агульную сістэму ўяўленняў, у гістарычных музеях ідзе назапашванне, захоўванне, першасная апрацоўка і сістэматызацыя крыніц. У выніку абагульнення атрыманых даных яны ператвараюцца ў сістэму навуковых фактаў, што суадносіцца з ужо існуючымі ведамі і ўяўленнямі. Менавіта па гэтай прычыне гістарычныя музеі не маюць права адмовіцца ад навукова-даследчай дзейнасці і ператварыцца ў цэнтры адпачынку.

*Мэта артыкула* – абазначыць праблемы арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў гістарычных музеях Рэспублікі Беларусь.

Пад тэрмінам «навукова-даследчая дзейнасць у музеі» разумеецца пазнавальная дзейнасць, у якой у цесных суадносінах знаходзяцца навукова-фондавая, навукова-экспазіцыйная, культурна-адукацыйная (у аспекце навукова-асветніцкай) работа і даследаванні ў рэчышчы профільных навук, якія арыентаваны на атрыманне, абгрунтаванне, сістэматызацыю і папулярызацыю ведаў, вылучаных падчас працы з музейным зборам і матэрыялам у рамках профільных навук.

Паводле даных, прыведзеных у Дзяржаўным рэестры музеяў Рэспублікі Беларусь на 2025 г., у нашай краіне налічваецца 158 (з іх 4 прыватныя) музеяў, у ліку якіх 32 дзяржаўныя музеі гістарычнага профілю сферы культуры, за выключэннем падпарадкаваных іншым ведамствам і прыватных музеяў, 1 – гісторыка-этнаграфічны, 1 – гісторыка-краязнаўчы, 3 – ваенна-гістарычныя, якія складаюць 23,4 % ад агульнай колькасці музейных устаноў [4]. Асобнае месца сярод гістарычных музеяў надаецца дзвюм установам рэспубліканскага падпарадкавання: Нацыянальнаму гістарычнаму музею Рэспублікі Беларусь і Беларускаму дзяржаўнаму музею гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У дадзеным кантэксце аўтар аб'ядноўвае ўстановы гістарычнага, гісторыка-этнаграфічнага, гісторыка-краязнаўчага, ваенна-гістарычнага профіляў пад агульнай назвай «гістарычныя музеі». У Рэспубліцы Беларусь налічваецца 37 музеяў дадзенай групы, у тым ліку 3 размешчаны ў г. Мінску (2 з іх рэспубліканскага падпарадкавання), па 7 – на тэрыторыі Брэсцкай і Магілёўскай абласцей, па 6 – на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай і Гомельскай абласцей, 2 – у Гродзенскай вобласці.

Адной з найважнейшых праблем арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў гістарычных музеях Беларусі з'яўляецца недахоп кадраў, які прыводзіць да перагрузкі астатніх супрацоўнікаў. У апошні час гэтая праблема закранае не толькі музеі раённага ўзроўню. Дастаткова востра недахоп кадраў адчуваецца ў музеях рэспубліканскага падпарадка-

вання. Што тычыцца невялікіх музеяў, дзе штатныя 5–7 супрацоўнікаў ажыццяўляюць розныя напрамкі дзейнасці, а фонды па колькасці перавышаюць некалькі тысяч адзінак захоўвання, то тут можна весці гаворку аб тым, што навукова-даследчая работа будуецца на энтузіязме музейных работнікаў. Так, напрыклад, у Ваенна-гістарычным музеі імя Д. К. Удовікава (г. Драгічын Віцебскай вобл.) на дадзены момант навуковай, фондавай і асветніцкай работай займаюцца дырэктар установы, захавальнік фондаў і два навуковыя супрацоўнікі [5], нягледзячы на тое, што па стане на 1 студзеня 2023 г. асноўны і навукова-дапаможны фонды музея складалі звыш 6,5 тыс. адзінак захоўвання. Амаль аналагічная сітуацыя з недахопам кадраў у Лёзненскім ваенна-гістарычным музеі (г. п. Лёзна Віцебскай вобл.), фонд якога складае больш за 21 тыс. адзінак захоўвання, з якіх звыш 12,5 тыс. – прадметы асноўнага фонду. Музейны фонд Музея бітвы за Днепр (г. п. Лоеў Гомельскай вобл.) складае больш за 5,7 тыс. адзінак захоўвання. Азначаныя вышэй праблемы паўстаюць амаль у кожным музеі раённага падпарадкавання. Сёння патрабуюць далейшага паляпшэння ўмовы захоўвання фондавых калекцый, мадэрнізацыя сістэмы ўліку музейных прадметаў. Складанай застаецца ў некаторых музеях сітуацыя з плошчай фондасховішч, якая абмежавана па памерах. Важна для музеяў мець дадатковае фінансаванне навукова-даследчай дзейнасці, якое б дазволіла навуковым супрацоўнікам працаваць у айчынных і замежных архівах, наведваць іншыя музеі з мэтай абмену вопытам і г. д.

Працэс навуковага даследавання Д. І. Цвярская звязвае з асобай работніка, яго эрудыцыяй, вопытам, працоўнай актыўнасцю. Навуковы супрацоўнік, удзельнічаючы ў навукова-асветніцкай рабоце, пашырае кругагляд, знаёміцца з вынікамі развіцця больш шырокіх галін навукі. Для гэтага павінен быць выкарыстаны прынцып калектыўнасці (стварэнне аддзелаў, сектараў). Шмат увагі даследчыца надае стварэнню ва ўстановах, у тым ліку музеях, навуковага архіва, дзе былі б сканцэнтраваны ўсе дакументальныя матэрыялы, неабходныя для распрацоўкі тэмы: яе бібліяграфія, справаздачы аб навуковых камандзіроўках, тэматыка-экспазіцыйныя планы, рукапісы каталогаў, артыкулаў, манаграфій, пратаколы навуковых пасяджэнняў і г. д. [6, с. 15–16].

Значным недахопам у навукова-даследчай дзейнасці сучасных музеяў з'яўляецца адсутнасць прынятага метаду вымярэння паспяховай работы. Галоўным параметрам ацэнкі музея на працягу апошніх дзесяцігоддзяў з'яўлялася колькасць адзінак музейнага фонду. Аднак, па сутнасці, гэты параметр амаль не мае вагі, калі ў музеі не вядзецца навукова-фондавая, навукова-экспазіцыйная і навукова-даследчая работа. Адна справа захоўваць назапашанае багацце, а другая – вывучаць яго і выкарыстоўваць у адукацыйных і выхаваўчых мэтах. Таму сёння

дастаткова актуальным з'яўляецца ўвядзенне гадавых норм на некаторыя віды навукова-даследчай работы для супрацоўнікаў навуковых і фондавых аддзелаў (колькасць падрыхтаваных і апублікаваных навуковых артыкулаў па тэме даследавання, колькасць атрыбуціраваных музейных прадметаў і г. д.). Кантроль за іх выкананнем і ўлік павінен быць ускладзены на намесніка дырэктара па навуковай рабоце, а пры яго адсутнасці на дырэктара музея. Пры гэтым важную ролю адыгрывае актуальнасць тэм музейных даследаванняў і адпаведнасць іх задачам і профілю музея. Якасць і паўната праведзенай навукова-даследчай работы супрацоўнікам павінны быць вызначальнымі для ацэнкі яго дзейнасці пры правядзенні атэстацыі.

Дадатковы ўрон узроўню навукова-даследчай дзейнасці ў музеях Беларусі аказвае тэндэнцыя ператварэння іх у цэнтры вольнага часу, «пагоня» за колькасцю наведвальнікаў, часовых экспазіцый, немузейных мерапрыемстваў, імкненне выканаць і перавыканаць планавыя паказчыкі і павялічыць прыбытак. Сёння, як ніколі, музей запатрабаваны і папулярны толькі пры глыбокай навуковай прапрацоўцы фондавых калекцый, навукова-экспазіцыйнай, культурна-адукацыйнай дзейнасці ў аспекце навукова-асветніцкай работы. Паспяховае функцыянаванне музеяў залежыць ад прадуманай праграмы ўсёй даследчай працы, якая ўлічвае мноства фактараў, злучаных з асаблівасцямі дзейнасці пэўнага музея.

Сродкам камунікацыі з наведвальнікам і адначасова спосабам перадачы візуальнай інфармацыі аб гістарычным перыядзе ці асобе з'яўляецца музейны прадмет. Выяўленне яго ўласцівасцей і функцый з'яўляецца адной з актуальных задач навукова-фондавай дзейнасці. Менавіта ў музеі ў працэсе вывучэння і навуковага апісання прадмета спецыялістамі з'яўляецца магчымасць рэканструяваць яго сувязі з асяроддзем бытавання, вылучаючы грамадскае значэнне.

Па сутнасці, навукова-фондавая работа ўяўляе бесперапынны працэс авалодання інфармацыяй, ведамі, якія пасля выкарыстоўваюцца ў экспазіцыйнай, выдавецкай, адукацыйнай, маркетынгавай і іншых відах дзейнасці музейных устаноў.

Навуковыя публікацыі музейных супрацоўнікаў, у тым ліку фондавых аддзелаў, з'яўляюцца пэўным вынікам працы па вывучэнні, аднаўленні помнікаў мінулага і іх далейшым экспанаванні.

У музеях Рэспублікі Беларусь, паводле даных на пачатак 2024 г., захоўваецца 3,6 млн прадметаў асноўнага фонду [2]. Пры гэтым іх колькасць у гістарычных музеях Беларусі перавышае 1 млн. Значная частка культурнай спадчыны знаходзіцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Яго збор адносіцца да аднаго з буйнейшых у краіне і налічвае амаль 500 тыс. адзінак музейных прадметаў, якія размеркава-

ны па асобных калекцыях [3]. З гэтага вынікае, што ў гістарычных музеях ёсць вялікі патэнцыял для прадстаўлення ўласных фондаў з мэтай іх папулярызацыі. Вылучаныя на этапе навукова-фондавай дзейнасці ўласцівасці і функцыі музейнага прадмета ў экспазіцыйнай прасторы прымаюць новае ўнікальнае гучанне і прачытанне, зразумелае для розных катэгорый наведвальнікаў. Гэта своеасаблівая размова, якую вядзе музей са спажыўцом сваіх паслуг і адначасова фарміруе яго культурныя, маральныя, этычныя і эстэтычныя нормы. Такім чынам, можна сцвярджаць, што музейная экспазіцыя прадстаўлена ў цеснай сузалежнасці з навуковай і фондавай дзейнасцю.

Менавіта на Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь ускладзена місія па захаванні культурнай спадчыны ў межах усёй Беларусі, прадстаўленні беларускай нацыі як неад'емнай часткі сусветнай супольнасці, адлюстраванні этапаў развіцця краіны, здабыткаў беларускага народа, яго звычаяў і традыцый. Музейная экспазіцыя найлепшым чынам можа справіцца з гэтай задачай і прэзентаваць поўнасцю гісторыю Беларусі для шырокага кола наведвальнікаў розных узроставых катэгорый. Пытанне па аднаўленні пастаяннай экспазіцыі і будаўніцтве новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея на дадзены момант з'яўляецца вельмі актуальным. Гісторыя народа, краіны – гэта не толькі сукупнасць фактаў, дат і імёнаў, гэта асобая форма ўяўленняў аб мінулым (гістарычная памяць), якая патрабуе інтэрпрэтацыі і тлумачэння. Падтрыманне пераемнасці паміж пакаленнямі ў інтэрпрэтацыі гісторыі, недапушчэнне яе «перапісвання» без адпаведнай патрэбы з боку грамадства спрыяе аб'яднанню людзей вакол агульнай ідэі. Такім чынам, гістарычная памяць як адзін з ключавых кампанентаў культуры, як асобая форма ўяўленняў аб мінулым свайго народа і краіны павінна знаходзіцца ў аснове пастаяннай экспазіцыі галоўнага музея гісторыі Беларусі. Усе астатнія гістарычныя музеі нашай краіны павінны быць комплексным яго дадаткам.

Пры аналізе дзейнасці гістарычных музеяў раённага падпарадкавання ўлічвалася і тое, што супрацоўнікі гэтых устаноў займаюцца таксама выкананнем пазамузейнай работы па навукова-метадычным суправаджэнні дзейнасці раённых метадычных цэнтраў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. У разглядаемай групе музеяў 20 устаноў прыцягнуты да яе выканання (даныя за 2023 г.), акрамя Музея-сядзібы «Дзяржынава», Гісторыка-мемарыяльнага музея «Сядзіба Нямцэвічаў» і Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава. Гэтыя абавязкі былі ўскладзены на супрацоўнікаў музейных устаноў з пачатку 2000-х гг. Па сутнасці, работа па захаванні памяці пра герояў і ахвяр вайны разам з дзейнасцю па ахове гісторыка-культурнай спадчыны

становіцца асноўным відам дзейнасці музеяў раённага падпарадкавання, а вывучэнне прадметаў музейнага фонду адыходзіць на другі план.

Неад’емнай часткай музейнага жыцця, без якой немагчыма падрыхтоўка пастаянных і часовых экспазіцый, захаванне і аднаўленне фондавых прадметаў, з’яўляецца праца рэстаўратараў, якая патрабуе цеснага ўзаемадзеяння з захавальнікамі фондавых калекцый і спецыялістамі ў галіне тэхніка-тэхналагічных даследаванняў. Вынікі іх дзейнасці дазваляюць дакладней выявіць унікальныя тэхналагічныя і эстэтычныя асаблівасці музейнага прадмета, знайсці прыдатныя тэхналагічныя прыёмы рэстаўрацыі і правільна скласці праграму работ. Аднак далёка не ва ўсіх музеях Беларусі гістарычнага профілю ёсць рэстаўратары з пэўным досведам працы ў дадзенай вобласці, а ў некаторых музеях яны ўвогуле адсутнічаюць. На жаль, у большасці беларускіх музеяў захавальнікі калекцый часцей фіксуюць змены музейных прадметаў, чым шукаюць шляхі па правядзенні іх рэстаўрацыі і кансервацыі. Адзінае, што трэба заўсёды абавязкова памятаць: толькі пры сумеснай рабоце гісторыка, мастацтвазнаўца, рэстаўратара, спецыяліста ў галіне тэхніка-тэхналагічных даследаванняў можна дабіцца плённага выніку ў справе захавання, вывучэння і папулярызацыі музейных помнікаў.

Дзейснае функцыянаванне гістарычных музеяў як інстытутаў сацыякультурнай і гістарычнай памяці немагчыма без публікацыі манаграфій, навуковых артыкулаў, альбомаў, буклетаў, даведнікаў і г. д. Публікацыя вынікаў даследавання з’яўляецца важнай часткай работы навуковага супрацоўніка. Зусім іншы ўзровень – напісанне кандыдацкіх дысертацый, дзе сістэма шматлікіх патрабаванняў падчас іх падрыхтоўкі прымушае супрацоўніка, які паступіў у аспірантуру, павышаць якасць уласных навуковых даследаванняў. Доўгі шэраг матывацыйных фактараў фарсіруюць працэс росту прафесіяналізму аспіранта – сціснутыя часовыя рамкі, у якія аспірант павінен напісаць дысертацыю, наяўнасць мэты напісаць буйную працу па канкрэтнай тэме, ужыванне сістэмнага падыходу ў рашэнні задач. Не выключэннем з’яўляецца жаданне значна павысіць свой навуковы патэнцыял і сацыяльны статус. Кожны пункт, на думку расійскага даследчыка А. Э. Алакшына [1, с. 53–54], увязаны адзін з адным. Сціснутыя тэрміны, напрыклад, прывіваюць даследчыку навыкі прадуманага стратэгічнага планавання ўласнай дзейнасці; вялікі аб’ём працы, напісанай у сціслыя тэрміны, магчымы толькі пры выкарыстанні сістэмнага падыходу ў рашэнні шматлікіх вялікіх і малых задач; той жа вялікі аб’ём тэксту дысцыплінуе розум даследчыка масівам задач, вырашыць якія можна толькі з дапамогай яснага паняційнага апарату і г. д.

Паступова мы прыходзім да высновы, што шляхамі вырашэння праблем арганізацыі навукова-даследчай дзейнасці ў гістарычных музеях

Беларусі з'яўляюцца сістэмная праца супрацоўнікаў па ўдасканаленні падыходаў да навукова-даследчай работы, пошук матывацый з боку кіраўніцтва для паспяховай самарэалізацыі кожнага даследчыка і імкненне калектыву музея развівацца ў сучасных абставінах.

Такім чынам, каб разглядаць гістарычныя музеі з пункту гледжання інстытутаў сацыякультурнай і гістарычнай памяці, асноўнымі задачамі якіх з'яўляюцца захаванне і трансляцыя культурнай спадчыны, духоўных каштоўнасцей, ідэй і традыцый, а таксама эфектыўнае і рацыянальнае выкарыстанне музейнага патэнцыялу ў станаўленні і развіцці патрыятызму, пачуцця павагі да мінулага краіны, трэба павышаць ролю навукова-даследчай работы ў музейных установах, асабліва гістарычнага профілю. Праблемы, якія існуюць у гэтым кірунку, па сутнасці, з'яўляюцца вырашальнымі, але патрабуюць пэўнай увагі з боку кіраўніцтва музеяў і вышэйстаячых арганізацый.

1. *Алакшин, А. Э.* Наука в музее / А. Э. Алакшин. – СПб. : Петрополис, 2019. – 92 с.
2. Инфографика «О культуре в Республике Беларусь, 2023 год» / Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/kultura-sport-sredstva-massovoy-informatsii/kultura-i-otdykh/ (дата обращения: 05.09.2024).
3. Музейное собрание / Национальный исторический музей Республики Беларусь. – URL: https://histmuseum.by/muzejnoe-sobranie/ (дата обращения: 05.09.2024).
4. Рэестр музеяў (на 2025) / Государственный каталог Музейного фонда Республики Беларусь. – URL: http://cdn.dkmf.by/RegisterOfMuseums.pdf (дата обращения: 27.08.2024).
5. Сотрудники музея / Боевой листок Военно-исторического музея им. Дмитрия Карповича Удовикова. – URL: http://www.d-museum.by/show_about.php?id=3 (дата обращения: 05.09.2024).
6. *Тверская, Д. И.* Музей как научно-исследовательское учреждение / Д. И. Тверская // Музейное дело в СССР / ред. И. М. Поспелова. – М., 1974. – С. 5–17.

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 15.01.2025.